# Першы стрэл

У гісторыі вельмі рэдка здараецца, каб вядомым было імя чалавека, які першы стрэліў у якой–небудзь вайне. З такім рэдкім здарэньнем мы маем дачыненьне ў гісторыі змаганьня беларусаў за незалежнасьць ад бальшавіцкай Расеі.

Пад канец сьнежня 1917 г. у Менску сабраўся Ўсебеларускі зьезд, які меў вырашыць лёс Беларусі. Бальшавікі, у чыіх руках быў тады Менск, разагналі гэты Зьезд. Не адважыліся ўсё–такі зрабіць тое самае з Вайсковай Цэнтральнай Радай. Гэтая Рада арганізавала беларускіх вайскоўцаў да збройнага змаганьня за незалежнасьць Беларусі.

Толькі праз месяц, ноччу з 31 студзеня на 1 лютага 1918 г. бальшавікі вырашыліся напасьці і на Раду. Канвой аўтамабіляў, загружаных чырвонагвардзейцамі і матросамі, наблізіўся да будынку Рады. Загасіўшы пражэктары і схаваўшы за рагом вуліцы свае аўтамабілі, бальшавікі акружылі будынак і занялі ўсе ўваходы і выхады.

Чэкістаў і матросаў, якія ўварваліся ў будынак, сустрэў намесьнік старшыні Белвайскцэнтрады Канстанцін Езавітаў. Запытаў бальшавікоў, чаго ім трэба. Іхны кіраўнік, махаючы рэвальвэрам, заявіў, што ён мае загад арыштаваць усіх членаў Рады і аднаго з пасыльных хлопчыкаў, 14–гадовага Апанаса.

Прачытаўшы загад на пісьме, К. Езавітаў адказаў бальшавікам, што спаўненьне іхнага жаданьня арыштаваць “усіх” членаў Рады немагчымае. Па–першае, іх больш за сто чалавек (пры гэтых словах бальшавікі палахліва паўзводзілі куркі сваіх рэвальвэраў і пачалі азірацца на ўсе дзьверы). Па–другое, працягваў Езавітаў, у будынку знаходзіцца толькі дзясятая частка ўсіх членаў. Калі ўсё–такі бальшавікам дзеля выкананьня загаду трэба кагосьці арыштаваць, хай арыштуюць яго, Езавітава, і сакратара Васіля Захарку, бо яны двое адказваюць за ўсю працу Рады.

Кіраўнік бальшавікоў пачаў спрачацца, але гучны стрэл з ружжа ў суседнім пакоі перапалохаў яго і матросаў. Адразу згадзіліся яны забраць толькі Езавітава і Захарку. Пасадзілі іх у аўтамабілі, успыхнулі агні пражэктараў, і канвой шалёна панёсься па пустых вуліцах Менску ў штаб Чэка.

А хто страляў? Гэта быў 12–гадовы пасыльны хлопчык Кастусь, які спаў са сваім старэйшым братам Апанасам. Калі матросы прыйшлі па Апанаса і пачалі яго будзіць, прачнуўся і Кастусь. Схапіў са сьцяны набітае ружжо, якое ўвечары даручыў яму адзін з дэлегатаў на перахаваньне, і ўзяўся бараніць брата.

Куля нікога не закранула, але жарты скончыліся. Калі бальшавікі разганялі Ўсебеларускі зьезд, завязаўся толькі кулачны бой з прымяненьнем лавак і што там было пад рукою, але ніхто не страляў. Кастусь першы схапіўся за зброю.

Праз тры тыдні ўзялі зь яго прыклад дарослыя члены Рады. Лейтэнант Езавітаў уцёк зь сябрамі з бальшавіцкай няволі, сабраў сваіх людзей і выгнаў бальшавікоў зь Менску. Іхнае кіраўніцтва ледзь пасьпела ўцячы са сваёй сядзібы чорным ходам. Затрымалася ажно ў Смаленску.

Цікава толькі, чаму бальшавікі так заеліся на хлопчыка Апанаса. Быццам бы прадчувалі, што ў пакоі пасыльных хлапчукоў тоіцца іх самы люты вораг.

*Друкуецца паводле публікацыі ў:* Ніва. 1995. 26 сакавіка. № 13. С. 6.